**Д. А. Тракала**

# ВОБРАЗ НОВАЙ ЖАНЧЫНЫ КІТАЯ Ў ТВОРЫ ЧЖАН АЙЛІН «СЫСЦІСЯ НА ЧАС»

Вобраз “новай” жанчыны актуальны не толькі ў кітайскім грамадстве пачатку 20-га стагоддзя, але і ў сучасным, сведчаннем чаму з’яўляецца творчасць Мо Яня, Чжан Цзе, Дзін Лін, Лу Вэньфу і інш. Згодна з А. Ю. Анцыферавай, *пад вобразам новай жанчыны варта разумець моцную, гарманічную, жывую асобу для якой характэрна самастойнасць мыслення, рашучасць прапанаваць уласны альтэрнатыўны варыянт грамадскага і асабістага жыццяўладкавання.* Мастацкаму асэнсаванню сутнасці дадзенага вобраза прысвечаны творы выбітнай кітайскай пісьменніцы Чжан Айлін “Каханне, якое разбурае гарады”, “Пачуцці, розум”, “Сысціся на час”, “Чырвоная ружа, белая ружа” і інш.

Сярод важных асаблівасцей жаночых вобразаў Чжан Айлін вылучаецца іх цесная сувязь з біяграфіяй пісьменніцы. Многія рысы характару і бытавыя сітуацыі, у якіх аказваюцца гераіні, не з'яўляюцца плёнам аўтарскай выдумкі, а адлюстроўваюць жыццёвы вопыт самой пісьменніцы або яе бліжэйшага акружэння.

У творы Чжан Айлін «Сысціся на час» (1976) падзеі пачынаюць разгортвацца ў перыяд Другой сусветнай вайны. Пісьменніца расказвае пра жыццё Шэн Цзюлі і блізкіх ёй людзей. Галоўнай асаблівасцю гэтага твора з'яўляецца тое, што менавіта праз вобраз Цзюлі Чжан Айлін апісвае сваё ўласнае жыццё, дзеянні і пачуцці.

Аналіз тэксту дазваляе выявіць, што на фарміраванне вобраза «новай» жанчыны Кітая ў дадзеным творы значны ўплыў аказала маці гераіні Жуйцю, якая з'ўлялася прататыпам маці самой Чжан. Жуйцю валодала выдатнымі

знешнімі данымі і вострым розумам, ніколі не мірылася з абставінамі. Жанчына была майстарам маніпулявання людзьмі, часта карысталася сацыяльным статусам і сувязямі для дасягнення жаданага выніку. Таксама сваю ролю ў стварэнні вобраза адыграў шэраг знакавых жыццёвых абставін: падзеі Другой сусветнай вайны, развод бацькоў, опіумная залежнасць бацькі, частыя ад'езды маці за мяжу. Гэтыя акалічнасці, несумненна, стала моцным імпульсам да змены светапогляду і паступовай трансфармацыі мадэлі жыцця. Апісваючы адносіны паміж маці і дачкой, Чжан Айлін фарміруе вобраз «новай» жанчыны Кітая, якая дэманструе настойлівае імкненне да самастойнасці ў волевыяўленні, паважае індывідуальны выбар і не імкнецца да асуджэння, як гэта звычайна адбывалася ў кітайскім традыцыйным грамадстве.

Такім чынам, у творы «Сысціся на час» вобраз «новай» жанчыны Кітая вылучаюць такія якасці як вострае імкненне да незалежнасці і нястомная прага пабудаваць сваё жыццё па-за межамі “культуры падпарадкавання”. «Новая» жанчына Кітая валодае нязломнай воляй і выдатным інтэлектам, каб рэалізавацца ў свеце, поўным цяжкасцяў, войн і перашкод.